УДК 930.2(476.5) "1727"

# НАЗІРАННІ ЗА ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦЁМ ПОЛАЦКА (па матэрыялах актаў кнігі полацкага магістрата за 1727 г.)

*Д. У. Дук*
доктар гістарычных навук, прафесар
рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова

*Па матэрыялах актаў кнігі магістрата Полацка за 1727 г. разгледжаны звесткі пра ўнутранае (побытавае) жыццё гараджан і гарадскі асяродак. У кнізе прадстаўлены ўнікальныя звесткі пра захаванне гістарычнай памяці ў найменні тапаграфічных аб'ектаў Полацка ("маскоўскі перакоп", "шанец маскоўскі"). Зроблена выснова, што прыгарадны двор Прасмужкі ў 1720-х гг. фактычна меў статус полацкага пасада. Інфармацыя пра штодзённы побыт палачан прадстаўлена ў апісанні асобных катэгорый нерухомых і рухомых аб'ектаў.*

**Ключавыя словы:** Полацк, кніга полацкага магістрата, гістарычная тапаграфія, побыт, рамяство.

## Уводзіны

Матэрыялы па гісторыі Полацка са складу 45 захаваных полацкіх магістрацкіх кніг XVIII ст. практычна не прадстаўлены ў археаграфічных выданнях. На гэтым фоне публікацыя кнігі 1727 г., падрыхтаваная А.М. Латушкіным і М.Д. Макаравым і надрукаваная ў 2012 г., з'яўляецца станоўчым выключэннем [1]. Па назіранні М. Д. Макарава, у фондзе 1823 ("Полацкі магістрат") Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі большасць з 45 кніг XVIII ст. складаецца пераважна з актыкацыі дакументаў шляхты Полацкага ваяводства і слаба асвятляе ўнутранае жыццё горада. На гэтым фоне актавая кніга 1727 г. (разам з кнігамі 1728 і 1729 гг.) выгадна вылучаецца багаццем зместу і разнапланавасцю дакументаў [1, с. 22].

З апорай на звесткі кнігі звернем увагу на ўнутранае (побытавае) жыццё Полацка і яго жыхароў. Адразу адзначым, што гэтых звестак у кнізе 1727 г. сустракаецца ўсё ж не так багата. У гэтым сэнсе найбольш інфарматыўнай з захаваных кніг полацкага магістрата з'яўляецца кніга 1656–1667 гг. [2], тым не менш некаторыя звесткі з кнігі 1727 г., напрыклад па гістарычнай тапаграфіі Полацка, больш не сустракаюцца ў іншых пісьмовых крыніцах.

**Тапаграфічныя заўвагі.** Вялікая колькасць актаў кнігі 1727 г. датычыцца спраў, звязаных з мяшчанамі ці маёмасцю прыгараднага полацкага мястэчка Прасмужкі. Гэты "двор" з "будынкамі дворнымі і гуменнымі", "бравярнямі", з "конямі, быдлам усялякім – рагатым і нерагатым", "з усім набыткам рухомым" і інш. 2 красавіка 1727 г. быў здадзены ў арэнду гродскаму рэгенту Полацкага ваяводства Алексію Юзафу Спірыдовічу тэрмінам на тры гады [1, с. 112–113]. Таксама двор Прасмужкі неаднаразова згадваецца ў справах куплі-продажы дамоў.

Па пісьмовых крыніцах XIV–XVIII стст. вядома, што "сяльцо" Прасмужкі з ворыўнымі землямі і сснажацямі было размешчана на ўсход ад Вялікага пасада за валатоўкамі ці "гарамі Балгарэйскімі" [3, арк. 51–51 адв.; 4, с. 86; 5, с. 143]). Сёння гэтая тэрыторыя ўваходзіць у межы Полацка і размешчана на ўсход ад вуліцы Юбілейнай. Двары і "грунты" маёнтка Прасмужкі ў кнізе 1727 г. і род заняткаў яго жыхароў па апісанні былі ідэнтычныя забудове і заняткам насельніцтва старадаўніх полацкіх

© Дук Д. У., 2020

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

пасадаў. Фактычна двор Прасмужкі ў 1720-х гг. меў статус пасадскай тэрыторыі, нароўні з левабярэжнай часткай Полацка – Крыўцовым і Экіманскім пасадамі. Гэтую выснову падмацоўваюць найменні кшталту “мешчанін полацкі з Прасмужак”.

Шмат разоў у кнізе згадваецца сельскагаспадарчае прадмесце ў Бельчыцы (“Кабак[1] Бельчыцкі ці Баханьскі”, частка Крыўцовага пасада), на якім пераважна размяшчаліся агароды, засеяныя ячменем, і сенажаці [1, с. 95]. Памеры агародаў і сенажацяў тут былі большыя за звычайныя надзелы зямлі на Вялікім пасадзе, Запалоцці ці ў Прасмужках і вызначаліся ў памеры да некалькіх пляцаў[2]. Падвор’і “на Кабаку” былі абнесены плотам (відавочна, драўляным), мелі вароты [1, с. 101].

Гэты “Кабак Бельчыцкі ці Баханьскі” па статусе быў аналагічны двару Прасмужкі, паколькі перыядычна цалкам ці часткова здаваўся ў арэнду розным уладальнікам.

Упершыню ў кнізе 1727 г. мы знайшлі звесткі пра вуліцу Скурачынскую ў Запалоцці [1, с. 163].

З бліжэйшых полацкіх ваколіц згадваецца вёска Ропна, якая і сёння знаходзіцца на аддаленасці 5 км на захад ад Запалоцця, у той час гэтую вёску атачаў лес. Адзін з запісаў паведамляе, што “злодзей закапаў пад Полацкам на Ропне, у лесе” частку скрадзеных пенязяў [1, с. 166]

Бадай, самае цікавае тапаграфічнае апісанне кнігі тычыцца тэрыторыі каля Ніжняга замка[3] і старажытнага полацкага гарадзішча[4]. Так, у запісе ад 23 чэрвеня гаворка ідзе пра продаж чатырох надзелаў зямлі, размешчаных на поўнач ад Ніжняга замка. Гэтая тэрыторыя цікавая тым, што тут пралягаюць два рэчышча ракі Палаты – старое і новае. Старое рэчышча Палаты (азярына і пратокі пад назвай “Палацішча”) атачае гарадзішча з поўначы і захаду, з усходу яно засыпана зямлёй, па якой пракладзена дарога на гарадзішча. Па сведчанні мясцовых старажылаў, гэтая дарога і насып былі зроблены пасля 1948 г., калі пачалася актыўная забудова былога гарадзішча[5].

Пра будаўніцтва Ніжняга замка, паводле Р. Гейдэнштэйна, вядома наступнае: да 1563 г. горад стаяў “при подошве холма, который москвитяне впоследствии заняли Стрелецкою крепостью” [6, с. 54]. Вусныя паданні пра змену рэчышча Палаты дажываюць у горадзе да XX ст., звесткі пра іх сустракаюцца ў паведамленнях Зарыяна Далэнгі-Хадакоўскага і Івана Пятровіча Дэйніса. У прыватнасці, у 1822 г., падчас наведвання Полацка, З. Далэнга-Хадакоўскі занатаваў наступнае: “Полоцк на Двине, главное место древних полочан, имеет кроме замков особое Городище меж старого и нового течения речки Полоты – оно видно при въезде в Полоцк на левой стороне и употреблено для кладбища. Несмотря на то что тут часто роются, однако еще приметен насыпной чернозем” [7, с. 111]. У паведамленні З. Далэнгі-Хадакоўскага прама згадана існаванне старога рэчышча Палаты. Таксама аўтар па-

[1] Тэрмін “кабак” у дачыненні да мясцовасці каля Бельчыц фіксуецца ў кнігах полацкага магістрата з XVIII ст. і з’яўляецца ўстойлівым маркерам гістарычнай тапаграфіі Полацка таго часу.

[2] Плошча пляца, па рэвізіі 1765 г., намі была вызначана ў дыяпазоне ад 1077 да 1236 кв.м., звычайна на Вялікім, Запалоцкім і Крыўцовым пасадах зямельныя надзелы мяшчан і шляхты складалі 1/8, 1/4, 1/2 часткі пляца, што было каля 125–150, 250 300, 500–600 кв.м адпаведна.

[3] Ніжні замак быў пабудаваны ў 1563 г. па загадзе Івана Грознага падчас захопу Полацка ў гады Лівонскай вайны. Будаўніцтва замка істотна змяніла гістарычную тапаграфію Полацка. Для насыпання вала Ніжняга замка, які сярод палачан і зараз называецца “вал Івана Грознага”, было пракапана новае рэчышча Палаты. З таго часу за Замкавай гарой пры вусці Палаты замацавалася назва “Верхні замак”, а старажытнае гарадзішча аказалася адрэзаным новым рэчышчам Палаты ад Вялікага пасада. У XVIII ст. Ніжні замак канчаткова страціў сваё абарончае значэнне.

[4] Старажытнае полацкае гарадзішча, ці “Рагвалодава гарадзішча”, з’яўляецца першапачатковым дзяцінцам Полацка, своеасаблівым “пунктам адліку” гістарычнай тапаграфіі Полацка. Было заселена з I тыс. н. ч., у XVIII ст. на гарадзішчы размяшчаліся каталіцкія могілкі.

[5] Гэтыя звесткі занатаваны намі падчас раскопак на полацкім гарадзішчы ў 2007 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ведамляе пра наяўнасць культурнага пласта ("насыпнога чарназёму") у падножжа гарадзішча, па якім быў пракладзены ўзвоз з усходняга боку, які і сёння размешчаны там жа. І.П. Дэйніс занатаваў паданне пра капанне новага рэчышча Палаты і падрабязна разгледзеў яго з апорай на вядомыя яму крыніцы ў рукапісе "Полацкай даўніны" [8, с. 12].

Запісы ў кнізе 1727 г. таксама пацвярджаюць захаванне ў той час гістарычнай памяці пра падзеі 1563 г. і прадстаўляюць новыя даныя пра змену рэчышча Палаты падчас будаўніцтва Ніжняга замка: "Другі грунт, памерам паўтары чвэрці пляца … там жа, над ракой Палатой, над шляхецкім былым млынам лежачы, з аднаго боку вуліцы, названай Сабачай, з другога боку ад рова альбо перакопу маскоўскага"[1], "трэці грунт на цэлы пляц над млынам таксама шляхецкім, дзе перад тым паркан быў, перакопам праз Маскалёў канец таго пляца перакапаны… тыльным бокам да самага перакопу альбо шанца маскоўскага прылеглы" [1, с. 168]. Дадзенае паведамленне сведчыць, папершае, пра наяўнасць перакопу (старога рэчышча Палаты), па-другое, пра наяўнасць паркана (відавочна, гэта паркан Вялікага пасада, які ў XVIII ст. ужо не аднаўляўся) і, па-трэцяе, пра мэтавае прызначэнне перакопу – для будаўніцтва "шанца"[2] Ніжняга замка, вядомага ў Полацку пад назвай "вал Івана Грознага".

Дарэчы, працытаваны запіс з кнігі не адзінкавы, дзе згадваюцца гарадскія ўмацаванні. Так, дакумент ад 27 чэрвеня сведчыць пра наяўнасць у "месце Полацкім" на вуліцы Невельскай у накірунку ад рынку ўчастка зямлі, які размешчаны "з аднаго боку каля грунціку яго міласці пана Пятра Мінгайлы, з другога боку – каля перакопу месцкага" [1, с. 178]. "Перакоп месцкі" – гэта абарончы роў паркана.

**Сродкі перамяшчэння.** Традыцыйнымі сродкамі перамяшчэння па рацэ Дзвіне, згаданымі ў кнізе, былі чоўны. На чоўнах перавозіліся тавары, нярэдка на вялікія сумы [1, с. 125]. Паводле кнігі полацкага магістрата за 1656–1657 гг. вядома, што чоўны аснашчаліся ветразямі (згадваецца "ветразь чоўнавы") [2, арк. 273].

**Аб'екты нерухомасці.** Кніга ўтрымлівае акты, у якіх называюцца аб'екты нерухомасці без іх дэталёвага апісання (напрыклад, "дом", "свіран", "гумно" і інш.). Найбольш інфарматыўнымі з'яўляюцца паведамленні такога роду: за парканам на вуліцы Ільінскай згадана "старое гумно" бурмістра Яна Лянчыцкага, якое было агароджана "занядбалым парканам" [1, с. 127], ці паведамляецца пра "згарэлы стары будынак" на пляцы, размешчаны паміж вуліцамі Ільінскай і Прабойнай, "на самым рагу" [1, с. 85].

Цэнтральныя гарадскія вуліцы, як, напрыклад, Вялікая ў Запалоцці, масцілася дрэвам (у тэксце літаральна пазначана "кладка" – драўляная брукаванка) [1, с. 259]. Адсылка ў тэксце пра "накірунак ад кладак вуліцы ў бок завулка" можа сведчыць пра адсутнасць брукавання другарадных гарадскіх вуліц ці завулкаў.

**Рамесныя прафесіі.** Сярод рамесных прафесій згадваюцца кушнеры, краўцы, шапачнікі, шаўцы, ткачы, гарбары, слесары, цырульнікі. Згаданы і цэхі (краўцоў, шапачнікаў і кушняроў). Сярод працоўнага люду згадваюцца бабылі – асобы "без вызначанага роду заняткаў", якія "жывуць з працы сваіх рук" [1, с. 58, 78, 83, 88, 109, 135, 206, 222]. Натуральна, у кнізе прадстаўлены далёка не ўсе рамесныя прафесіі Полацка першай трэці XVIII ст., а толькі тыя з іх, якія трапілі ў разгляд магістрацкіх паседжанняў.

**Нерухомая маёмасць.** Традыцыйна ў тэстаментах шляхты і мяшчан пералічваецца шмат рэчаў з рухомай маёмасці (пераважна адзенне, тканіна, дарагі по-

[1] Тут і далей пры цытаванні крыніцы прадстаўлены аўтарскі пераклад з польскай на беларускую мову.

[2] У дадзеным выпадку пад тэрмінам "шанец" трэба разумець агульную назву палявых умацаванняў без вызначэння іх віду.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

суд, упрыгожанні і інш.), пералік іх багаты і ў асобных справах, звязаных з вопісам маёмасці, у прыватнасці, у некаторых актах аб крадзяжах. Адзначым таксама, што пералік рухомай маёмасці з асобных скарбовых "скрынь" займае некалькі старонак, як, напрыклад, рэчаў са скрыні нябожчыцы Марыяны Мушынскай. У вопісе пералічапы ўсе рэчы, падрабязна апісаны іх стан і колькасць. Вопіс зроблены па наступных катэгорыях: сукны, хусты, срэбра, золата, пенязі, каштоўныя паперы [1, с. 247–254]. Аднак, бадай, самым цікавым прадметам, згаданым у актавай кнізе, з'яўляюцца "акуляры ў футарале" [1, с. 111].

**Рысы побыту.** У кнізе згадваюцца асаблівасці побыту мяшчан і шляхты. Па справе аб крадзяжы трох мяхоў жыта бабылямі Філіпам Гулідычам і Якімам Жакам паведамляюцца наступныя дэталі: скрадзенае жыта было схавана на ложку, жыта знаходзілася ў мяху з радніны і было накрыта спадніцай [1, с. 82].

Адзначым яшчэ адну цікавую дэталь побыту: на хрэсьбінах нехта Філіп Гулідыч частаваў хросных бацькоў "кашай з аліўкавым алеем і з перцам". Праўда, далей ідзе рэмарка: "елі кашу не з аліўкавым алеем, а з алеем" [1, с. 83]. З пункту гледжання сённяшніх кулінарных пераваг каша з алеем і перцам відавочна здзіўляе. Дарэчы, абвінавачаныя ў крадзяжы бабылі жылі "з працы рук", гэта значыць, "перабіваліся" часовымі заробкамі.

Згадваюцца ў кнізе і аб'екты крадзяжоў (напрыклад, лес з пушчы, якая належыла Глеба-Барысаўскаму базыльянскаму кляштару). Уяўляе цікавасць і спалучэнне ў дачыненні да старажытнага Бельчыцкага манастыра назвы "Глеба-Барысаўскі" замест традыцыйнага "Барыса-Глебскі". Згадана тут і "вулічнае" ўзбраенне, з дапамогай якога мяшчане напалі на вікарыя (гэта "кіі" і "драгі") [1, с. 71].

## Заключэнне

Такім чынам, запісы ў кнізе актаў магістрата Полацка за 1727 г. нароўні з рэдкімі і цікавымі назіраннямі за паўсядзённым жыццём насельніцтва Полацка сведчаць пра захаванне гістарычнай памяці пра "маскоўскі перакоп" у першай трэці XVIII ст. Гэта пацвярджае ўстойлівае захаванне гістарычнай памяці пра падзеі далёкага мінулага ў Полацку ў эпоху ранняга новага часу.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. Кніга магістрата места Полацка 1727 г. – Беласток : Беларускае навуковае таварыства. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2012. – 406 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1823. Воп. 1. Спр. 1. Актавая кніга Полацкага магістрата за 1656–1657 гг.
3. НГАБ. – Фонд 1823. Воп. 1. Спр. 17. Актавая кніга Полацкага магістрата за 1732 г.
4. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. : в 6 вып. / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977–1989. – Вып. 1 / сост. А. Л. Хорошкевич. – 1977. – 228 с.
5. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 6 вып. / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977 – 1989. – Вып. 2 / сост. А. Л. Хорошкевич. – 1978. – 220 с.
6. ***Гейденштейн, Р.*** Записки о Московской войне (1578–1582) / Р. Гейденштейн. – СПб. : Издание археографической комиссии, 1889. – 309 с. [указатели – 27 с.].
7. ***Далэнга-Хадакоўскі, З.*** Выбранае / З. Далэнга-Хадакоўскі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 448 с.
8. ***Дэйніс, І. П.*** Полацкая даўніна / І. П. Дэйніс ; уклад., прад. і камент. М. Баўтовіча ; пер. з руск. мовы М. Ермалаева. – Мінск : Медисонт, 2007. – 330 с.


Паступіў у рэдакцыю 16.06.2020 г.
Кантакты: rector@msu.by
(Дук Дзяніс Уладзіміравіч)

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**Duk D. OBSERVATIONS OF POLOTSK DAILY LIFE (based on the acts of the Polotsk Magistrate book of 1727).**

*According to the Polotsk Magistrate book dated 1727 the author has studied the information about the internal (everyday) life of citizens and the urban environment of Polotsk. The book presents unique data on the preservation of historical memory in the names of the topographic objects of Polotsk ("Moskovski perekop"). It is concluded that in fact the suburban courtyard of Prasmuzhka at least in the 1720s had the status of Polotsk Posad. The information about the everyday life of Polotsk citizens is presented in the description of certain categories of immovable and movable objects.*

**Keywords:** Polotsk, Polotsk Magistrate book, historical topography, everyday life, trade.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова